# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА КАСТРЫЧНІК



**3 кастрычніка, *аўторак.*** Стрыжка валасоў сёння да няўдачы ў справах і працы. Афарбоўка таксама не лепшая ідэя.

**4 кастрычніка, *серада.*** Калі вы хочаце прыцягнуць у сваё жыццё новых людзей, разнастаіць будні захапляльнымі падзеямі, сустрэць сваё каханне, то адпраўляйцеся да цырульніка сёння. Вынік афарбоўвання таксама прыемна здзівіць.

**5 кастрычніка, *чацвер.*** Сёння лепш не стрыгчыся, інакш можна наклікаць непрыемнасці. Неспрыяльны дзень і для афарбоўвання валасоў.

**6 кастрычніка, *пятніца.*** Стрыжка непажаданая, можа негатыўна паўплываць на настрой. Афарбоўванне таксама лепш адкласці.

**7 кастрычніка, *субота.*** Пасля стрыжкі валасы будуць добра расці, умацуюцца і набудуць устойлівасць да знешніх уздзеянняў, будуць менш секчыся. Афарбоўка натуральнымі фарбавальнікамі будзе прыцягваць грошы.

**8 кастрычніка, *нядзеля.*** Неспрыяльны дзень для стрыжкі, прыводзіць да аслаблення агульнага імунітэту арганізма, што павышае верагоднасць узнікнення рознага роду захворванняў. Афарбоўка тоіць небяспеку сур'ёзных негатыўных наступстваў.

**9 кастрычніка, *панядзелак.*** Сёння лепш проста падраўняць валасы. Фарбавацца толькі ў салоне і толькі ў правераны колер.

**10 кастрычніка, *аўторак.*** Калі падстрыгчыся сёння, вочы стануць больш зоркімі, слых вастрэйшым. Добры дзень для афарбоўкі валасоў у любы колер.

**11 кастрычніка, *серада.*** Спрыяльны дзень для новай прычоскі. Фарбаваць валасы ў светлыя адценні непажадана.

**12 кастрычніка, *чацвер.*** Марыце разбагацець — наведайце цырульню. Для афарбоўвання рэкамендуецца выкарыстоўваць фарбы на натуральнай аснове.

**13 кастрычніка, *пятніца.*** Стрыжка сёння катэгарычна проціпаказаная. Вельмі неспрыяльны дзень для фарбавання валасоў.

**14 кастрычніка, *субота.*** Падраўнялі кончыкі валасоў сёння, і ваш імунітэт падвысіцца, праўда, валасы замарудзяць свой рост. Удалымі адценнямі для афарбоўкі будуць светлыя і рудыя.

**15 кастрычніка, *нядзеля.*** Пасля сённяшняга візіту ў цырульню ў вас не толькі будуць хутчэй расці валасы, але і ў хуткім часе чакаецца прыемнае знаёмства з персонай супрацьлеглага полу. Валасы ні ў якім разе нельга абясколерваць, а фарбаваць толькі натуральнымі фарбамі.

**16 кастрычніка, *панядзелак.*** Наведванне цырульніка сёння абяцае вам прыліў жыццёвых сіл, але валасы стануць непаслухмянымі. Афарбоўванне можа справакаваць канфлікты.

**17 кастрычніка, *аўторак.*** Стрыгучыся сёння, памятайце, што тым самым вы праганяеце са свайго жыцця шанцаванне і поспех. Калі вярнуць натуральны колер валасоў, можна ўзмацніць свой сацыяльны статус.

**18 кастрычніка, *серада.*** Змена прычоскі не лепшым чынам адаб'ецца на самаадчуванні. Спрыяльны дзень для афарбоўвання.

**19 кастрычніка, *чацвер.*** Сёння абсалютна непрыдатны дзень для наведвання цырульніцкага салона.

**20 кастрычніка, *пятніца.*** Спрыяльны дзень для стрыжкі валасоў. Афарбоўванне спрыяльнае толькі ў першай палове дня.

**21 кастрычніка, *субота.*** Абстрыганне валасоў сёння можа справакаваць галаўныя болі. Ад афарбоўвання адмоўцеся.

**22 кастрычніка, *нядзеля.*** Сёння можна эксперыментаваць са стрыжкай. Афарбоўванне — толькі ў цырульніка, інакш валасы будуць слабымі і пасечанымі.

**23 кастрычніка, *панядзелак.*** Выдатны перыяд для стрыжкі, якая паспрые станоўчым зменам у кар'еры і адносінах з калегамі. Спрыяльны дзень для афарбоўвання валасоў — жыццё стане нашмат ярчэйшым.

**24 кастрычніка, *аўторак.*** Неспрыяльны дзень для стрыжкі, якая прыводзіць да паслаблення агульнага імунітэту арганізма. Афарбоўванне варта адкласці.

**25 кастрычніка, *серада.*** Стрыжка валасоў сёння панізіць імунітэт і пагоршыць самаадчуванне. Ад афарбоўвання таксама адмоўцеся.

**26 кастрычніка, *чацвер.*** Стрыжка катэгарычна забаранеца, бо яна можа ў далейшым вельмі неспрыяльна паўплываць на ваш лёс. Афарбуйце валасы натуральнымі фарбамі.

**27 кастрычніка, *пятніца.*** Вельмі спрыяльны дзень для стрыжкі. Ён прынясе здароўе валасам і ўзмоцніць вашу знешнюю прывабнасць. Фарбаваць валасы можна толькі ў цёмныя колеры і толькі натуральнымі фарбамі.

**28 кастрычніка, *субота.*** Стрыжка валасоў сёння добра паўплывае на настрой. А вось афарбоўванне не рэкамендуецца.

**29 кастрычніка, *нядзеля.*** Стрыжка прывядзе да паляпшэння матэрыяльнага стану і агульнага дабрабыту. Афарбоўваць валасы дазволена толькі ў натуральныя колеры.

**30 кастрычніка, *панядзелак.*** Пасля стрыжкі прычоска зусім не будзе трымаць форму, валасы стануць непаслухмянымі. Афарбоўваць валасы можна, але толькі з дапамогай натуральных фарбаў.

**31 кастрычніка, *аўторак.*** Стрыжку лепш перанесці на больш спрыяльны перыяд. Ні ў якім разе нельга абясколерваць валасы.

Вожык
Часопіс сатыры і гумару

## КАВУН

Лета адышло з двара,
Восень карагодзіць.
Кавуновая пара
Ўрэшце надыходзіць.

Захацела смакаты
Старая Агася.
Рынак быў за паўвярсты,
Але ж паплялася.

Ляжаць грудай кавуны,
Цешаць усім вочы,
Нібы тыя кабаны,
Толькі што не рохчуць.

Доўга баба выбірала,
Мацала, круціла.
І пазногцем калупала,
І далонню біла.

Каб нутро ажно гуло,
Каб сухі хвасточак,
Каб, дзе кветкаю цвіло,
Ладны быў кружочак.

Вось знайшоўся прыгажун!
Добра выглядае.
Ды і ўмовам той кавун
Усім адпавядае.

А вялізны — тыдзень несці.
Толькі як яго данесці?

«Так і быць!» Кавун купіла.
І цягнула, і каціла,
Несла нават на плячы
(Некаму ж дапамагчы!),

Злосна чорта памінала,
Але ўсё ж дашыбавала.
Увагнала нож у мякаць...
Ну, і як тут не заплакаць?

Хоць кавун
меў выгляд значны,
Толькі быў зусім нясмачны.
Потым баба ўсім казала:
«Мусіць, доўга выбірала!»

**Раіса ВАСІЛЬЕВА,**
*г. Гомель.*

## ГРАФІК

Локшыну знаёмы Толя
Жонцы вешае Аўдолі:
— Графік церпіць
перамены,
Сёння мне
ў начную змену.
А прыгожым
цёплым ранкам
Шпацыруе ад каханкі.
Нос у нос у сенцах —
з Колем:
Збыўся графік і ў Аўдолі!

**Уладзімір ГАЙДУК,**
*г. Навагрудак.*



## УКРОП І МОРКВА

*БАЙКА*

На агародзе з важнай пыхай соп,
Высока чуб задзёршы свой, Укроп.
Пацвельваўся ён з Морквы дзень пры дні:
— Ні таўшчыні ў цябе, ні вышыні!
А кволая, а ніцая якая!
І што цябе, няўдаліца, чакае?
Каб мог хадзіць, даўно, напэўна, сам
Аднёс цябе б на двор скарміць трусам.
Ды восенню зняэрдлівы Укроп
Ад зайздрасці яшчэ мацней засоп:
Аж зззяла Морква ў цётκі пад рукой,
Век жыў — не бачыў чырвані такой!

***

Пакуль не ўзважыў ты свой ураджай,
Суседаў поспех лепш не заніжай.

**Нічыпар ШЭРАНЬКІ**
*г. Мінск.*

## АФАРЫЗМЫ

Мужчыны, якія гавораць дрэнна пра жанчын, звычайна маюць на ўвазе толькі адну.

*Рэмі дэ Гурмон, французскі пісьменнік і тэарэтык літаратуры.*

Жонка суцяшае мужа ў няшчасцях, якіх ніколі не будзе ў халасцяка.

*Невядомы аўтар.*

Ажаніцца — гэта значыць напалову скараціць свае правы і ўдвая павялічыць абавязкі.

*Артур Шапенгаўэр, нямецкі філосаф-ідэаліст.*

Каханне часта адбірае розум у таго, хто яго мае, і дае тым, у каго яго няма.

*Дэні Дзідро, французскі філосаф і пісьменнік.*



## Жыццё

Бавіцца Дзяцінства,
Нешта ўсё выгадвае,
І на гэта Сталасць
Пазірае з кпінамі.
Маладосць пра Старасць
Нават і не згадвае,
Старасць у Юнацтва
Лезе з успамінамі.

## Калі забаліць галава...

Як галава ў вас зрэдку
Забаліць —
Вы супакойцеся
І ўтаймуйце злосць.
Няхай такая думка
Весяліць,
Што галава у вас,
Прынамсі, ёсць!

## Хопіць сіл

Бяжыць паціху ўніз
Жыцця дарога,
І адпачыць дзесь з краю
Ёсць жаданне...
Кахання для мяне
Ужо замнога,
Ды хопіць сіл яшчэ
На заляцанне.

## Межы

Шкада,
Але прызнаць належыць,
Што розум недзе
Мае межы.
Ды толькі
Самае паганае,
Што глупства —
Неабмежаванае!

**Міхась МІРАНОВІЧ,**
*г. Віцебск.*

## Прыпеўкі з перцам для душы і сэрца

Маю я прыпевак, сваццця,
У запасе з паўмяха.
Смела гэтае багацце
Аддала б за жаніха.

***

Што ты ля мяне гарцуеш?
Лепш купляй хутчэй
«пежо».
Задарма не пацалую,
Бо навучаная ўжо.

***

У таго няма настрою,
Хто з кішэняю пустою.
Як мільён туды пакласці —
Аж засвеціцца ад шчасця!

***

У мяне ёсць на прыкмеце
Ясь, Кузьма,
Кірыл ды Пеця.
Ласыя ўсе да віна —
Вось таму і сплю адна.

***

Мілы так прыгожа кажа,
Бы карункі з шоўку вяжа.
А я слухаць байкі мушу,
Бо на тое маю вушы.

***

У адной жанчыны-кралі
Грошы ўсе на рынку
ўкралі.
Муж злуецца і дзяўбе:
«Хай сцягнулі б лепш цябе!»

**Праспявала**
**Людміла ЮШЫНА,**
*г. Гомель.*

## Калектыўная праца

Ўшчувае настаўніца Вову:
«Тваё сачыненне — бы здзек!
Як столькі памылак пісьмовых
Зрабіць мог адзін чалавек?»

Хлапец адказаў хітравата:
«Чаму гэта толькі адзін?
Гадзіну пісалі мы з татам,
І дзед яшчэ — восем гадзін...»

## Па-за канкурэнцыяй

Праходзіў конкурс
прафмайстэрства ў нас.
Журы прызнала, ды і ўся акруга,
Што лепшы педагог на гэты час —
Шырокая бацькоўская папруга.

**Уладзімір ЦАНУНІН,**
*г. Вілейка.*

## АБ'ЯВА

На прыступках магазіна
Дзве вясёлыя жанчыны
Штосьці ўважліва чытаюць,
Між сабою разважаюць:

— Вось аб'ява ад мужчыны:
Мужам стане на гадзіну
І пазбавіць ад турбот.
Далей — пералік работ.

— Ножкі ў шафе прымацуе,
Сцены ў кухні пафарбуе
Ды парамантуе кран —
Здольны муж, а не баран.

— Дываны павыбівае,
Толк у працы, пэўна ж, знае.
Зробіць ён усё старанна,
Без ныцця ды нараканняў.

— А чаму ж ён піша «муж»?
Значыць, і на тое... дуж!
Дзве жаночыя рукі
Адарвалі нумаркі.

**Валянціна**
**БАБКО-АЛЯШКЕВІЧ,**
*Салігорскі раён,*
*в. Радкава.*



## АНЕКДОТЫ

Перад вяселлем: ён кажа, яна слухае.
Пасля вяселля: яна кажа, ён слухае.
Праз год пасля вяселля: абодва кажуць, а суседзі слухаюць.

* * *

Сустрэліся двое сяброў. Адзін з іх амаль раз'юшаны і аніяк не можа прыйсці ў сябе.
— Што здарылася? — пытаецца другі.
— Ды пайшоў з жонкай у кіно, і села са мной побач такая прыгажуня!
— Ну, я б гэта назваў шчасцем.
— Чаму?
— А ты ўяві адваротную сітуацыю: прыходзіш у кіно з прыгажуняй і выпадкова побач з вамі садзіцца твая жонка!

**Даслаў Леў КАЗЛОЎ,**
*г. Мінск.*